Ю.В. Назаранка (Мінск, БДУ)

# КОЛАСАВА АФАРЫСТЫКА: ЛЕКСІКА-ФРАЗЕАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Слова ў вузкім сэнсе (лексічная адзінка, моўны знак) — гэта асноўны матэрыял для пабудовы паведамлення; яно ў самім сабе нясе зернетка будучага паведамлення і тых іншых слоў, з якіх яно (паведамленне) будзе сфармавана. Якуб Колас як творца, які працуе са словам, добра ўсведамляў задачу пошуку патрэбнага слова. Ён пісаў:

*Ніяк не клеіцца размова,*
*Хоць думак шмат у галаве, —*
*І трудна **тое знайсці слова,***
***Што сотні слоў другіх заве.*** (VIII 184)

Задоўга да навуковага ўразумення прэцэдэнтнага характару слова Якуб Колас чуццём мастака ўлавіў і выказаў гэту ідэю. Таму ёсць падставы для дэдуктыўнага сцвярджэння, што лексіка Коласавых твораў (у тым ліку і выслоўяў) не можа быць выпадковай. Гэта тычыцца лексікі паэта наогул — па-за межамі яе разгляду з пазіцый вучэння аб тропах. Хоць трэба адразу прызнаць — усё, што можна сказаць значнага пра лексіку выслоўяў, так ці інакш будзе закранаць мастацкую вартасць слова і мець дачыненне да яго вобразнага ўжывання.

Вельмі багатая і разнастайная апелятыўная лексіка выслоўяў Якуба Коласа. Прадстаўлены ўсе яе тыпы — ад самых канкрэтных (*страха, хата, рака, лес, каршун, воўк, вужака, возера, ралля, гара* і безліч іншых) да абстрактна-адцягненых (*лёс, неруш, юнацтва, дзяцінства, становішча, даль, стварэнне, зрок* і г.д.). Невыпадкова лексікон твораў пісьменніка, як сведчыць картатэка, налічвае звыш трыццаці тысяч адзінак. Адсюль і багацце кантэкставай сінанімікі, без чаго няма мастацкага стылю, параўн.: гаварыць — *кідаць, нізаць словы, сыкаць вужакаю, сварыцца, лашчыць слух, крычаць, хваліцца, расказаць, разважаць, нарабіць гуку, пытацца, злаваць, перадражніваць, распацешыць сэрца, плакаць, уздыхаць, апавядаць, развязаць языкі, таўчы ваду ў ступе, спрачацца, не сходзіць з языка, гу-гу!, адазвацца, гутарыць, назваць, загадаць, размаўляць, лаяцца, закалыхваць, заспакойваць, як у сценку ўляпіць, працягаць голас, паўтарыць, растлумачыць, распытваць, счапіцца, секчы языкам, выказаць, пасведчыць, пытацца, салгаць, выпажыць думку, весці вар'яцкія сказы, дайсці да пункту, выкладаць навукі, крануць, пахваліць, палаяць, узводзіць паклёп, падаць думку, муляць язык* і пад.

Якуб Колас па-майстэрску і вельмі шырока выкарыстоўвае ў выслоўях фразеалогію, пераважна народную: *скінуць гужы* 'вызваліцца', *выйсці ў жыццё* 'нарадзіцца', *пайсці наперакор* 'запярэчыць', *адвесці ліха* 'пазбавіцца няшчасця', *сысці ў цьму* 'знікнуць', *затаптаць у гразь* 'знішчыць', *сыкаць вужакаю* 'злавацца', *трымаць нос высока* 'ганарыцца', *трымаць лыч панура* 'сумаваць', *маралі чытаць* 'павучаць', *даць па карку* 'пакараць', *утапіць у лыжцы* 'знішчыць', *і гора мала*

‘нармальна’, *ліха прыкупіць* ‘пайсці на ўсё’, *запраторыць у магілу* ‘пагубіць’, *таўчы ваду ў ступе* ‘гаварыць, рабіць пустое’ і інш.

Фразеалагізмы ў выслоўях:

*Жывеш, ліпіш, як на калу ты,*
*І ногі й рукі ўздзеты ў путы. (VI 29)*
*З адным рассватаешся тут,*
*Там у другі залазь хамут. (VI 246-247)*
*І як жа зямелька іх носіць?*
*Чаму іх не высмаліў дым? (VIII 285)*
*Прывык ты чужымі рукамі*
*Выгортваць арэхі з агню. (VIII 313)*
*Хоць ты падай прад ім лістам —*
*І да трох не гавары! (III 7)*

Арганічна ўваходзяць у моўную тканку выслоўяў фразеалагічныя звароты, утвораныя самім аўтарам, але ў такіх выпадках, відаць, маем справу з вобразным ужываннем слова, з тым ці іншым рытарычным прыёмам. Да такіх выпадкаў можна аднесці наступныя выслоўі:

*— А дзе карась?*
***— Зашыўся ў гразь**... (III 204)*

*Будзем **плыць памалу далей**,*
*Хоць далёка берагі…(I 59)*
*Пільнуй — цішком скажу між намі, —*
*Каб і **язык** не **ўцёк** часамі. (VI 178)*
*Але ж спрэчка — не сварка, і дружбы не разбіла, хоць і **зрабіла ў ёй (дружбе) шчыліну**. (IX 456)*
*Прылашчыць Груня —*
*І **Магамет на рай** свой **плюне**! (X 187)* і інш.

У заключэнне адзначым, што вывучэнне лексічных асаблівасцяў выслоўяў па-за межамі стылістыкі і рыторыкі — спроба вельмі ўмоўная, паколькі ўсе канструкцыйныя элементы іх уваходзяць у склад адзінак, якія ўжо самі па сабе, цэласна, па прыродзе самога жанру з’яўляюцца вобразным адлюстраваннем рэчаіснасці.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Аксамітаў, А.С. Беларуская фразеалогія. — Мінск, 1978.
2. Базыленка, А.М. Народныя фразеалагізмы ў мове твораў Якуба Коласа / Вялікі пясняр беларускага народа. Зборнік артыкулаў. — Мінск., 1959.
3. Бірыла, М.В. Роля Якуба Коласа ў развіцці беларускай літаратурнай мовы / Весці АН БССР. Серыя грамад. навук. — 1982. — № 5.
4. Даніловіч, М.А. Граматычная характарыстыка фразеалагізмаў. — Мінск, 1991.
5. Занкевіч, Л.Я. Структурна-граматычны склад фразеалагізмаў у паэме Якуба Коласа «Новая зямля» / Творчество молодых. — Мінск, 1978.